■ Выбары-2016: праграмы кандыдатаў

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА

### КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ЯСЕНІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ №100 МЕЛЯШКЕВІЧА ЮРЫЯ ВІКТАРАВІЧА



На гэтыя выбары мы ідзём з «Народнай праграмай», поўны тэкст якой можна пабачыць на сайце — prahrama.by. Гэта зборнік прапаноў па выпрацоўцы новага, пазітыўнага бачання будучыні Беларусі, распрацаваных вядомымі ў краіне экспертамі.

Мэта нашай праграмы — трансфармацыя Беларусі ў сучасную эфектыўную еўрапейскую дзяржаву, у падмурку якой знаходзяцца каштоўнасці дэмакратыі, вяршэнства права, гарантуюцца правы чалавека і прынцыпы свабоднай канкурэнтнай рынкавай эканомікі.

**Прыватная ўласнасць — падмурак усіх эканамічных свабодаў**

Беларусі неабходна заканадаўча замацаваная прыватная ўласнасць на зямлю. Мы прапануем: прызнаць роўныя зямельныя правы ўсіх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, заканадаўча вызначыць асаблівы статус сялян як спецыфічнай катэгорыі грамадзян, звязаных з вытворчасцю і пастаўкамі сельскагаспадарчай прадукцыі, распрацаваць зямельны падатак і ўмовы іпатэкі, стварыць умовы для прыцягнення замежнага капіталу, сфарміраваць рынак зямлі.

**Стварэнне новых працоўных месцаў**

Мы бачым 4 крыніцы новых працоўных месцаў. Першая — індывідуальныя прадпрымальнікі, мы прапануем знізіць стаўкі адзінага падатку ў тры разы, знізіць стаўкі арэнды ў тры разы, скараціць адміністрацыйны і бюракратычны абарот. Гэта дазволіць цягам двух гадоў стварыць дадаткова каля 300 тысяч новых працоўных месцаў. Другая крыніца — малы бізнес, трэцяя — замежныя інвестыцыі, чацвёртая — дзяржаўныя прадпрыемствы, якія пройдуць рэструктурызацыю, мадэрнізацыю, частковую альбо поўную прыватызацыю.

**Энергетыка і экалогія**

Мы патрабуем спынення будаўніцтва Астравецкай АЭС. Патрэбная актыўная распрацоўка ўсіх альтэрнатыўных, экалагічна чыстых крыніц энергіі (сонечная, энергія ветру), што можа забяспечыць краіне 50% ад колькасці спажываемай сёння энергіі і рэзка знізіць залежнасць ад знешніх паставак. Стварэнне больш празрыстага і канкурэнтнага энергетычнага рынку павінна спрыяць зніжэнню кошту энергіі для спажыўцоў.

Мы патрабуем забароны выкарыстання ў сельскагаспадарчых мэтах забруджаных чарнобыльскіх тэрыторый.

**Барацьба з карупцыяй**

У выніку кіравання цяперашняй улады ў Беларусі ўтварылася палітычная, эканамічная, прававая сістэма, не здольная функцыянаваць без карупцыйных схем. Па ўзроўні распаўсюджвання карупцыі Беларусь займае 123-е месца ў рэйтынгу Transparency International. Для эфэктыўнай барацьбы з карупцыяй мы прапануем вярнуць грамадзянам Беларусі магчымасць выбараў кіраўнікоў краіны і рэгіёнаў на сумленных і празрыстых выбарах, стварыць мясцовае самакіраванне, даць свабоду прэсе, аднавіць незалежнасць судовай сістэмы, усталяваць грамадскі кантроль за дзейнасцю чыноўнікаў, скараціць кіраўніцкі апарат, распрацаваць кодэкс паводзінаў службовых асоб, заахвочваць непадкупнасць і адказнасць чыноўнікаў.

**Сярэдняя і вышэйшая адукацыя**

Мы патрабуем ліквідаваць кантрактную сістэму ва ўсёй краіне, у тым ліку і ў школе, зменшыць нагрузку на настаўніка — не больш за пяць урокаў у дзень пры стаўцы ў 18 гадзін. Пераход на 12-гадовую школьную сістэму, развіццё сеткі прыватных школ, якія маюць частковае бюджэтнае фінансаванне, і вядома, падвышэнне заробку настаўнікам, давядзення яго да сярэдняга па краіне. У сферы вышэйшай адукацыі мы прапануем адмяніць абавязковае размеркаванне выпускнікоў, стварыць сістэму квот, вакансій для маладых спецыялістаў.

**Пенсійная рэформа**

Мы прапануем: пенсійная сістэма павінна прадугледжваць стварэнне дзяржаўнага назапашвальнага страхавога пенсійнага фонду, дапаўненне працоўных пенсій недзяржаўнымі і сацыяльнымі, адмена ўраўнілаўкі, залежнасць памеру пенсіі ад працоўнага ўкладу, індэксацыя пенсій шляхам прымянення індывідуальнага каэфіцыента заробку пенсіянера, упарадкаванне пенсійных ільгот.

Каб павялічыць памер пенсій, мы прапануем адлічэнне ў пенсійны фонд не менш чым 30 працэнтаў сродкаў, атрыманых ад прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА

### КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ШОСТАГА СКЛІКАННЯ ПА ПАЎДНЁВА-ЗАХОДНЯЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 98 АД ЛІБЕРАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ КАЗЛОВА ЯЎГЕНА АНАТОЛЕВІЧА

# ЗА МОЦНУЮ БЕЛАРУСЬ!



Мэта маёй работы ў парламенце — умацаванне краіны. Моцная Беларусь — рэспубліка, дзе ажыццяўляецца сацыяльнае партнёрства грамадства і дзяржавы, ёсць эканамічная разнастайнасць. Моцная Беларусь — гэта інтэграцыя ў сусветную эканоміку і ператварэнне ў аднаго з лідараў Усходняй Еўропы. Моцная Беларусь — гэта краіна, якой кіруюць дзяржаўнікі: ініцыятыўныя і мабільныя кіраўнікі.

Прыярытэты маёй работы ў парламенце наступныя.

**У пытаннях развіцця акругі:**

Пашырыць паркавыя тэрыторыі, выканаць азеляненне і рэканструкцыю санітарна-ахоўных зон уздоўж транспартных магістраляў, пачаць будаўніцтва шумавога экрана ўздоўж МКАД і чыгункі, давесці паказчык азелянення да сярэдняга па горадзе.

Актывізаваць развіццё сістэмы электронных дзяржаўных паслуг праз інтэрнэт.

Садзейнічаць распрацоўцы і прыняццю новых правілаў эксплуатацыі дамавых тэрыторый (двароў, парковак і інш.).

Ініцыяваць упарадкаванне рэгламенту ўтрымання і выгулу дамашніх жывёл (буйных сабак, экзатычных рэптылій і інш.).

Садзейнічаць забеспячэнню аднолькавага доступу да медыцынскай інфраструктуры і паслуг (паліклінічных стацыянараў, высокатэхналагічнай медыцынскай дыягностыкі).

Працягнуць стварэнне безбар'ернага асяроддзя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Аптымізаваць графік і чарговасць руху гарадскога грамадскага наземнага транспарту, за кошт чаго інтэрвалы падыходу транспарту скараціць у сярэднім на 1—3 хвіліны.

Распрацаваць механізм падвозу дзяцей у дашкольныя ўстановы суседніх раёнаў аўтобусам «Малышок», фарсіраваць рэканструкцыю і стварэнне дзіцячых садкоў.

Патрабаваць вынесці буйныя прамысловыя прадпрыемствы за межы горада і арганізаваць падвоз супрацоўнікаў да іх.

Размясціць 2—3 пляцоўкі для воркаўта і 1 пляцоўку для скейтынга.

**У пытаннях адукацыі:**

Скараціць наменклатуру спецыяльнасцяў і праграм адукацыі, паглыбіць іх практычную накіраванасць, улічваць пры фарміраванні дзяржаўнага заказу на падрыхтоўку спецыялістаў наяўныя магчымасці рынку працы.

Аформіць на дагаворнай аснове падрыхтоўку спецыялістаў (студэнтаў, слухачоў) за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

Давесці акадэмічную мабільнасць студэнтаў і выкладчыкаў да 10% ад іх агульнай колькасці.

Увесці адзіны незалежны рэгламент атэстацыі педагагічных работнікаў.

Паставіць узровень аплаты працы педагагічных работнікаў у залежнасць ад поспехаў іх вучняў, у тым ліку з выкарыстаннем механізмаў ЦТ і незалежнай атэстацыі.

Прасоўваць экспарт адукацыйных паслуг, у тым ліку — паслядыпломнай адукацыі.

**У пытаннях эканамічнага развіцця:**

Садзейнічаць самазанятасці насельніцтва, у тым ліку — фермерскай, падтрымаць канкурэнцыю на рынку тавараў і паслуг.

Спрасціць механізмы перадачы памяшканняў, якія пустуюць, у карыстанне сярэдняму і малому бізнесу, змяніць прынцыпы падаткаабкладання для маладых інавацыйных прадпрыемстваў.

Акцэнтаваць увагу на рост экспарту інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій.

Стварыць адзіны рэспубліканскі каляндар падзейнага турызму, стымуляваць развіццё ўязнога турызму.

Актывізаваць персаніфікацыю пенсійных рахункаў і іншых сацыяльных выплат.

Фарміраваць механізм маладзёжных назапашвальных укладаў, у тым ліку страхавых.

**У знешняй палітыцы:**

Адстойваць незалежны знешнепалітычны курс.

Удасканальваць парытэт і ўзаемную выгаду адносін з краінамі свету, рэалізацыю транзітнага патэнцыялу краіны, рост эканамічнага складніка ў адносінах з далёкім замежжам.

Паскорыць дэмаркацыю дзяржаўных межаў, выступаць супраць размывання нацыянальных межаў.

Узмацніць супрацоўніцтва па праграмах ЮНЕСКА, каб пашырыць гарызонты светаўспрымання грамадзян.

■ Дзень горада

# Сталіца рыхтуецца да 949-годдзя

### Парк экстрэмальных відаў спорту, помнік у Верхнім горадзе і масавы забег

**Традыцыйна Дзень горада Мінска адзначаецца ў другія выхадныя верасня, аднак сёлета з-за парламенцкіх выбараў яго перанеслі на тыдзень раней. Якія мерапрыемствы 3-4 верасня жыхарам сталіцы варта наведаць, а ў якіх паўдзельнічаць асабіста, расказалі прадстаўнікі Мінгарвыканкама.**

Дзень горада — гэта не толькі маштабнае свята, але і значная падзея ў сацыя-культурным жыцці. Напярэдадні гулянняў, 2 верасня, будуць падведзены вынікі конкурсу «Лепшы па прафесіі». А на наступны дзень у Вялікім тэатры оперы і балета пройдзе ўрачыстая цырымонія прысваення ганаровага звання «Мінчанін года», атрымліваюць якое за дасягненні ў працы і асаблівы ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё сталіцы па выніках работы за год. Прымеркавана да Дня горада і адкрыццё новых і мадэрнізаваных сацыяльных аб'ектаў. Напрыклад, у Маскоўскім раёне пасля капітальнага рамонту зноў расчыніць дзверы першы корпус Дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў №1, у Фрунзенскім пачне работу новы дзіцячы садок № 44 (вул. Нёманская, 29), а ў Савецкім пасля мадэрнізацыі зноў пачне прымаць студэнтаў 33-я гарадская паліклініка. Вялікім падарункам для моладзі стане парк экстрэмальных відаў спорту (вул. Сталетава, 1). Дарэчы, на Дзень горада недалёка ад яго пройдзе міжнародны марафон на ролікавых каньках.

Сімвалічным для Года культуры стане адкрыццё на плошчы Свабоды помніка стваральнікам першай беларускай оперы «Сялянка» — кампазітару Станіславу Манюшку і драматургу Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. Падчас свята ў Верхнім горадзе можна будзе пачуць музыку знакамітага кампазітара, а таксама ўбачыць фрагменты тэатральных пастановак па матывах п'ес не менш вядомага драматурга.

Святочныя мерапрыемствы будуць арганізаваны па ўсім горадзе, а асноўнай канцэртнай пляцоўкай стане тэрыторыя каля Палаца спорту. У суботу свята завершыцца музычна-піратэхнічным феерверк-шоу.

Як адзначыла першы намеснік **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віталіна РУДЗІКАВА**, у падрыхтоўцы да свята актыўна задзейнічаны ўсе гарадскія структуры.

У Дзень горада заўсёды праводзіцца мноства спартыўных мерапрыемстваў, сёлета іх будзе больш за 20. Які ён, «Жалезны пажарны», даведаюцца гледачы паказальнага выступлення супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Нікога не пакіне абыякавым і Міжнародны турнір па сілавым экстрыме. Самай маштабнай спартыўнай падзеяй — каля 20 тысяч удзельнікаў — павінен стаць другі па ліку Мінскі паўмарафон.

Каля Палаца спорту разгорнецца святочны кірмаш і Горад майстроў. Гандлёвыя аб'екты, якія зоймуць плошчу ў 5 тысяч квадратных метраў, будуць працаваць з 10 да 23 гадзін. На працягу дня будуць праводзіцца майстар-класы па прыгатаванні нацыянальных беларускіх страў. Да Дня горада ўжо ў гэтыя выхадныя, 27-28 жніўня, у дзяржаўных крамах пройдзе адзіны дзень зніжак. Хто не паспее скарыстацца выгаднай прапановай, зможа набыць неабходныя тавары падчас самога свята — зніжкі будуць дасягаць 30 працэнтаў.

Азнаёміцца з падрабязнай праграмай мерапрыемстваў можна на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта **http://minsk.gov.by/ru/**.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

❍ Тым часам

## ГАМАРДЖОБА З БЕЛАРУСКІМ АКЦЭНТАМ

### У суботу ў сталіцы пройдзе фестываль грузінскай культуры

Тбілісоба — маляўнічае свята, прысвечанае заканчэнню збору ўраджаю. Штогод у канцы кастрычніка яно праводзіцца ў сталіцы Грузіі — Тбілісі — і збірае велізарную колькасць турыстаў, якія жадаюць далучыцца да масавых гулянняў. Аднак мінчане і госці беларускай сталіцы ўжо другі раз змогуць наведаць свята, не выязджаючы ў цёплую Грузію.

За гэта лета фестывалі нацыянальных культур сталі сапраўднай «фішкай» Верхняга горада. Мінчане паспелі пагрузіцца ў польскую, карэйскую, украінскую культуру і вось цяпер на чарзе — грузінская, зноў. Менавіта падчас леташняй Тбілісобы зарадзілася ідэя аб прадастаўленні пляцоўкі ў Верхнім горадзе дыяспарам, якія гатовы расказаць пра свае нацыянальныя асаблівасці.

Пасол Грузіі ў Рэспубліцы Беларусь Давід КАТАРЫЯ адзначыў, што паміж дзвюма дзяржавамі заўсёды былі цёплыя, сяброўскія адносіны. Аб іх умацаванні сведчыць штогадовае павелічэнне тавараабароту і турыстычнага патоку.

Як вядома, грузіны вызначаюцца сваёй гасціннасцю, таму і само свята пабудавана вакол гэтага: гасцей чакае вясёлае застолле. Нездарма другая назва фестывалю — гастранамічны: два дзясяткі рэстаранаў грузінскай і беларускай кухні прапануюць наведвальнікам свята традыцыйныя прысмакі. А размясціцца з імі госці змогуць за стометровым агульным сталом. Не абыдзецца свята і без гарачых грузінскіх танцаў і душэўных песень.